Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
______________В. М. Міхееў
«____»_____________2013 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____ /вуч.

# ФАЛЬКЛОРНЫ ПРАКТЫКУМ
## Раздзел 1. БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАЛЯНДАР

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05*
*Народная творчасць (фальклор)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2013

**СКЛАДАЛЬНІК**

*Н. В. Петухова,* выкладчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*аддзел* фальклarыстыкі і культуры славянскіх народаў дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследавання беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»;

*Т. Ф. Сухоцкая,* дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка», кандыдат культуралогіі, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 14.01.2013 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 06.02.2013 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Н. В. Петухова

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Фальклорны практыкум» складаецца з трох раздзелаў: «Беларускі народны каляндар», «Беларускія сямейна-родавыя абрады», «Абрадавая атрыбутыка».

Беларускі народны каляндар разглядаецца спецыялістамі як сістэма традыцыйных свят, прысвяткаў і паводзінскіх звычаяў, якія рэгламентавалі і ўпарадкоўвалі жыццё людзей на працягу года. Каляндар – складаная з’ява, у аснове якой ляжаць назіранні за астральнымі і прыроднымі цыкламі, сельскагаспадарчы вопыт, этнаэкалагічнае асэнсаванне этапаў чалавечага жыцця, вераванні, звычаі і абрады, творы вуснай народнай творчасці і нормы грамадскага жыцця народа. Працяглае суіснаванне ў Беларусі хрысціянскай і фальклорнай традыцый прывяло да іх арганічнага спалучэння і ўзаемадапаўнення. На падставе такога шырокага вызначэння беларускага народнага календара навукоўцы адасабляюць наступныя яго складаючыя: каляндар гаспадарчай дзейнасці (земляробчы ці аграрны), царкоўны каляндар (каталіцкі, праваслаўны), сямейны каляндар, дзіцячы народны каляндар і інш.

Выкладанне раздзела «Беларускі народны каляндар» вучэбнай дысцыпліны «Фальклорны практыкум» прадугледжвае сувязь з іншымі дысцыплінамі: «Беларускі фальклор», «Міфалогія», «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці», «Этнафанічны практыкум». Іх комплекснае ўзаемадзеянне заклікана ажыццяўляць асноўныя палажэнні па ахове, зберажэнні і прапагандзе каштоўнасцей традыцыйнай беларускай культуры, што патрабуе высокай ступені кампетэнтнасці будучых спецыялістаў у галіне этнамастацкага (этнафанічнага, этнахарэаграфічнага, гульнявога) увасаблення рэгіянальнага фальклору ў выхаваўчай і выканальніцкай дзейнасці.

*Мэта дысцыпліны* – пазнаёміць студэнтаў з гісторыяй фарміравання беларускага народнага календара, раскрыць асноўныя ўяўленні нашых продкаў аб упарадкаванні часу, а таксама ўзбагаціць разуменне студэнтамі беларускага народнага календара як унікальнай і самабытнай з’явы беларускай традыцыйнай народнай культуры, якая адлюстроўвае сістэму гуманістычных і сацыяльна-культурных каштоўнасцей беларускага народа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Задачы дысцыпліны:*

– пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі паняццямі і тэрміналогіяй вывучаемай дысцыпліны;

– засвоіць веды па гісторыі фарміравання беларускага календара ў кантэксце гісторыка-культурных сувязей з традыцыйнымі календарамі суседніх народаў;

– тэарэтычна і практычна (да ўзроўню саўдзелу ў святочных дзеях) азнаёміць студэнтаў са святамі гадавога цыкла і са структурай рытуальна-абрадавых комплексаў;

– раскрыць педагагічны патэнцыял каляндарных свят і абрадаў для фарміравання асобы;

– выпрацаваць практычныя этнафанічныя ўменні і навыкі выканання каляндарных песень і здольнасці да іх адэкватнага ўвасаблення і інтэрпрэтацыі на сучасным этапе;

– развіць актыўнае творчае мысленне і самастойнасць меркаванняў пры рэканструкцыі свят ва ўмовах дзейнасці ўстаноў культуры і адукацыі;

– сфарміраваць аналітычную кампетэнцыю даследчыкаў і пераемнікаў (забяспечыць разуменне спецыфікі і значнасці народных свят) для мадэлявання ўмоў захавання каляндарна-абрадавых комплексаў у іх будучай прафесійнай дзейнасці.

У выніку вывучэння дадзенага раздзела дысцыпліны выпускнік павінен *ведаць:*

– каляндарныя абрады беларусаў;

– законы існавання і пераемнасці традыцый у фальклорных асяродках;

– прынцып фарміравання на дакументальнай аснове рэпертуару спеўнай этнафанічнай суполкі, фальклорнага аб’яднання;

– методыку работы педагога-лідара з удзельнікамі ў фальклорным аб’яднанні;

*умець:*

– наладзіць працэс пошуку, развучвання і выканання рэпертуару фальклорнага аб’яднання, складзенага на дакументальнай аснове;

– перадаваць рэгіянальныя асаблівасці беларускага спеўнага фальклору ў галіне інтанавання і гуказдабывання;

– валодаць прынцыпамі мастацка-эстэтычнага кіравання дзейнасцю аматарскіх і прафесійных фальклорных калектываў і аб’яднанняў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– улічваць асабістыя творчыя асаблівасці ўдзельніка фальклорнага аб'яднання, неабходнасць імправізацыі і самавыяўлення пры фальклорнай дзейнасці.

Раздзел «Беларускі народны каляндар» мае тэарэтычную і практычную скіраванасць, прадугледжвае вывучэнне сутнасці і спецыфікі існавання каляндарных свят і абрадаў, іх структурных кампанентаў і рэгіянальных асаблівасцей, вызначэнне месца і ролі беларускага народнага календара ў жыццядзейнасці этнасу.

Пры вывучэнні раздзела «Беларускі народны каляндар» выкарыстоўваюцца наступныя метады навучання: тлумачальна-ілюстратыўныя, рэпрадукцыйныя метады (расказ, тлумачэнне, гутарка, дыскусія, лекцыя, дэманстрацыя кіна- і аўдыязапісаў, палявых відэазапісаў аўтэнтычных абрадаў, метад слыхавога пераймання ў працэсе актуалізацыі фальклорнай спадчыны), праблемныя (творчы дыялог, вопыт, назіранне, эксперымент), метады самастойнай работы студэнтаў (работа з першакрыніцамі, расшыфроўка паэтычных тэкстаў аўдыя- і відэаматэрыялаў), кантрольна-ацэначныя метады (адказы на семінарах, практыкаванні).

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае работу з навуковай і вучэбна-метадычнай літаратурай, вывучэнне студэнтамі асобных пытанняў дысцыпліны. Падчас самастойнай работы студэнты павінны старанна вывучыць тэарэтычны матэрыял, які быў выкладзены на лекцыйных занятках; прааналізаваць і законспектаваць матэрыял, прапанаваны выкладчыкам для самастойнага вывучэння, творча перапрацаваць і прадставіць у выглядзе рэферата.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Фальклорны практыкум» усяго адведзена 674 гадзіны, з якіх 326 –аўдыторныя заняткі (126 гадзін – лекцыі, 120 гадзін – практычныя заняткі, 80 гадзін – індывідуальныя заняткі); на вывучэнне раздзела «Беларускі народны каляндар» вучэбнай дысцыпліны «Фальклорны практыкум» прадугледжана 186 гадзін аўдыторных заняткаў (78 гадзін – лекцыі, 68 гадзін – практычныя заняткі, 40 гадзін – індывідуальныя заняткі).

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залікі і экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекц. | практ. | інд. |
| **Уводзіны** | 2 | 2 | | |
| **Раздзел I. Гісторыя календара. Сусветны, еўрапейскі і славянскі кантэксты** | | | | |
| ***Тэма 1.*** Сусветныя сістэмы летазлічэння | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 2.*** Календары ўсходніх славян | 2 | 2 | | |
| **Раздзел II. Народны каляндар як феномен традыцыйнай культуры беларусаў** | | | | |
| ***Тэма 3.*** Народны каляндар у сістэме этнаграфічных ведаў | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 4.*** Рухомыя і нерухомыя святы | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 5.*** Пост у сістэме народнага календара | 2 | 2 | | |
| **Раздзел III. Зімовы перыяд беларускага календара** | | | | |
| ***Тэма 6.*** Піліпаўка | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 7.*** Каляды ў традыцыйнай культуры беларусаў | 2 | 4 | | |
| ***Тэма 8.*** Калядныя песні | 18 | 2 | 10 | 6 |
| ***Тэма 9.*** Вадохрышча | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 10.*** Грамніцы (Стрэчанне) | 2 | 2 | | |
| **Раздзел IV. Веснавы перыяд беларускага календара** | | | | |
| ***Тэма 11.*** Абрады і святы сустрэчы вясны | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 12.*** Масленічны тыдзень | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 13.*** Этнафонія масленічных песень | 18 | 2 | 10 | 6 |
| ***Тэма 14.*** Гуканне вясны | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 15.*** Этнафонія песень гукання вясны | 16 | 2 | 6 | 8 |
| ***Тэма 16.*** Саракі | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 17.*** Дабравешчанне (Звеставанне) | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 18.*** Юр’е | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 19.*** Вялікдзень (Пасха). Валачобны абрад і валачобныя песні | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 20.*** Радаўніца (Радаўніцкія Дзяды, Наўскі Вялікдзень) | 6 | 2 | 4 | |
| ***Тэма 21.*** Ушэсце. Абрад ваджэння і пахавання стралы | 8 | 2 | 6 | |
| ***Тэма 22.*** Сёмуха (Тройца, Зелянец, Зялёныя святкі) | 8 | 2 | 6 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Раздзел V. Летні цыкл беларускага календара** | | | | |
| ***Тэма 23.*** Купалле (Івана, Яна) | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 24.*** Купальскія песні і гульні | 22 | 4 | 10 | 8 |
| ***Тэма 25.*** Пятра і Паўла (Пятрок) | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 26.*** Ілля | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 27.*** Жніўны абрадавы комплекс | 4 | 4 | | |
| ***Тэма 28.*** Этнафонія жніўных песень | 18 | 2 | 10 | 6 |
| ***Тэма 29.*** Спасаўка (Мядовы Спас, Яблычны, Хлебны, Арэхавы) | 2 | 2 | | |
| **Раздзел VI. Восеньскі цыкл беларускага календара** | | | | |
| ***Тэма 30.*** Успенне (Першая Прачыста) | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 31.*** Этнафонія песень восеньскага цыкла | 14 | 2 | 6 | 6 |
| ***Тэма 32.*** Багач (Другая Прачыста) | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 33.*** Узвіжанне (Трэцяя Прачыста) | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 34.*** Пакровы | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 35.*** Восеньскія (Змітраўскія) Дзяды, Асяніны | 2 | 2 | | |
| **Разам…** | **186** | **78** | **68** | **40** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Мэта і задачы дысцыпліны. Паняцце тэрміна «храналогія». Гістарычная і астранамічная храналогія. Асноўныя агульнапрынятыя адзінкі вымярэння часу – суткі, месяц (сінадычны і сідэрычны), год (сонечны, месячны, месячна-сонечны).

## Раздзел I. Гісторыя календара. Сусветны, еўрапейскі і славянскі кантэксты

### *Тэма 1. Сусветныя сістэмы летазлічэння*

Паходжанне тэрміна «каляндар». Каляндар месячны, сонечны, месячна-сонечны і яго сувязь з жыццезабеспячэннем традыцыйных супольнасцей. «Эра» – міфічная і рэальная. Старажытныя календары свету: кітайскі, індыйскі, зараастрыйскі, егіпецкі, календары мая і ацтэкаў. Вавілонскі каляндар. Старажытнаяўрэйскі і мусульманскі календары. Элінскі каляндар. Рэформы Салона. Метонаў цыкл. Каляндар Старажытнага Рыма. Паходжанне назваў месяцаў. Юліянскі каляндар, яго недакладнасць. Рэформа Аўгуста. Высакосныя гады. Асаблівасці летазлічэння ў Сярэднявеччы. Сутнасць грыгарыянскага календара, яго недахопы. Праекты рэфармавання грыгарыянскага календара. Рэспубліканскі каляндар Французскай рэвалюцыі 1789 г.

### *Тэма 2. Календары ўсходніх славян*

Характарыстыка сістэмы летазлічэння ўсходніх славян. Паходжанне стараславянскіх назваў дзён тыдня і месяцаў. Руская сістэма вылічэння часу. Сакавіцкі, ультрасакавіцкі і вераснёўскі стылі. Беларускі народны каляндар. Асаблівасці вылічэння часу ў Беларусі ў старажытныя перыяды яе гісторыі.

## Раздзел II. Народны каляндар як феномен традыцыйнай культуры беларусаў

### *Тэма 3. Народны каляндар у сістэме этнаграфічных ведаў*

Народны каляндар як сістэма традыцыйных свят і прысвяткаў на працягу гадавога цыкла. Паняцце «каляндарны абрад» – складаны сакральна-магічны комплекс, у склад якога ўвахо-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяць маўленчыя, песенныя, гульнявыя, драматычныя і харэаграфічныя жанры. Прыродная і міфалагічная асновы народнага календара. Цыклізацыя асноўных свят народнага календара ў адпаведнасці з фазамі сонцавароту. Працоўна-аграрны характар зместу асноўных свят і абрадаў народнага календара.

### *Тэма 4. Рухомыя і нерухомыя святы*

Адлюстраванне ў змесце народнага календара светапоглядных асноў розных гістарычных эпох. Хрысціянства і яго ўплыў на традыцыйную культуру народа. Упарадкаванне часу ў народным і хрысціянскім календарах. Фальклярызацыя хрысціянскіх свят. Рухомыя (пасхацэнтрычныя) і нерухомыя святы народнага календара.

### *Тэма 5. Пост у сістэме народнага календара*

Тэрапеўтычны і псіхалагічны плён часовага ўстрымання ад ежы. Хрысціянскі пост і яго засваенне народнай традыцыяй. Піліпаўскі пост. Вялікі пост. Пятроўскі пост. Характар абрадавых дзеянняў, прымеркаваных да пэўных перыядаў посту. Серадпосце. Выпяканне храсцоў.

## Раздзел III. Зімовы перыяд беларускага календара

### *Тэма 6. Піліпаўка*

Прыродныя і астральныя цыклы як аснова зімовай абраднасці. Народныя ўяўленні, звязаныя з Піліпаўкай. Пост. Асаблівасці харчавання. Апрацоўка льну (попрадкі). Вячоркі-пасядзелкі. Народныя метэаралагічныя назіранні і прыкметы. Пасніцкія і піліпаўскія песні («піліпаўскія», «мікольскія», «за кудзеляй», «на супрадках»). Стрыманы, «не голасны» тып выканання (у памяшканні). Азначэнні пасніцкіх песень («доўгія», «сапраўдныя», «колішнія» і інш.).

### *Тэма 7. Каляды ў традыцыйнай культуры беларусаў*

Этымалогія слова «каляда», генезіс і характэрныя рысы аднайменнага свята. Свята зімовага сонцастаяння ў народаў Еўропы. Каляды і Раство Хрыстова – характарыстыка дзвюх рэлігійна-культурных традыцый. Асноўныя этапы Каляд: тры куцці, іх назвы і значэнне. Абрады ваджэння казы, каня, жорава, мядзведзя на поўдні Беларусі. Калядныя гульні на поўначы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусі. Абрады хаджэння звездароў (калядныя абыходы хат з зоркай і іконай, выкананне хрысціянскіх песень). Калядная варажба, сельскагаспадарчая і шлюбная магія. Батлейка.

### *Тэма 8. Калядныя песні*

Традыцыйны склад каляднай спеўнай суполкі. Этнафанічная партытура каляднага абраду ў Беларусі. Рытмаінтанацыйныя асаблівасці калядных песень: рэчытатыўны характар, гучнае, «шумнае» выканальніцтва. Агульныя рысы і адрозненні калядак і шчадровак. Магічна-заклінальны і велічальны характар калядных песень гаспадару, гаспадыні, дзяўчыне і хлопцу. Рэгіянальныя асаблівасці калядных спеваў (калядныя напевы Беларускага Палесся і зімовыя традыцыі Беларускага Паазер'я). Рэфрэны-воклічы: «Добры вечар!», «Святы вечар!», «Каляда!», «Ой, калядкі» (Палессе) і «Коліда!», «Коліда, Коліда!», «Коліда, молада!» (Паазер'е). Канты (Паазер'е). Карнавальнасць светаадчування падчас калядных гульняў (з «казой», «буслам», «мядзведзем» і інш.). Абрадавыя гульні «Жаніцьба Цярэшкі», «Мацей», «Цары», «Яшчур» і інш.

### *Тэма 9. Вадохрышча*

Тэрапеўтычны і псіхалагічны плён водных працэдур. Рытуалы, звязаныя з вадой: хросны ход да вадаёма, высяканне крыжа з лёду, асвячэнне вады. Гаючыя ўласцівасці святой вады. Каталіцкае свята Тры каралі. Павер'і, назіранні і прыкметы Вадохрышча.

### *Тэма 10. Грамніцы (Стрэчанне)*

Паходжанне назваў свята. Язычніцкія рытуальныя рэлікты свята. Ушанаванне Бога Перуна (Грамаўніка). Рытуальныя ахвяраванні Перуну. Хрысціянскае тлумачэнне свята. Рытуалы з Грамнічнай свечкай.

## Раздзел IV. Веснавы перыяд беларускага календара

### *Тэма 11. Абрады і святы сустрэчы вясны*

Прыродныя і астральныя цыклы як аснова веснавой абраднасці. Веснавыя традыцыі і абрады ўсходніх славян. Генезіс, структура, функцыянальныя напрамкі і адметныя асаблівасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускіх свят сустрэчы вясны. Абрадавая ежа. Веснавыя гульні, карагоды.

### *Тэма 12. Масленічны тыдзень*

Генезіс свята і этымалогія слова «масленіца» (сырны тыдзень). Міфалагічная аснова абраднасці. Традыцыйная аснова свята провадаў зімы. Масленічныя (Стрэчаньскія) Дзяды. Рытуальная ежа. Масленічныя забавы і ігрышчы. Рытуальнае спальванне пудзіла Масленіцы (смерць зімы). Аб’езд жарабцоў. Катанне на санках. Матывы шлюбу: абрад «Цяганне калодкі», наведванне маладзіцы. Даравальная нядзеля. Падрыхтоўка да Вялікага посту.

### *Тэма 13. Этнафонія масленічных песень*

Эмацыянальны настрой і тэматыка песень. Масленіна (палізуха, каўзуха) – цэнтральны вобраз песеннага цыкла. Карнавальны характар масленічных песень. Гумарыстычныя, жартоўныя тэксты. Іранічныя сюжэты: «п’яная жонка і муж-сірата». Рэгіянальныя асаблівасці масленічных спеваў (тэрыторыя басейна верхняга цячэння Дняпра – Смаленшчына, Пскоўшчына, Віцебшчына, Магілёўшчына, Гомельшчына, Браншчына, Чарнігаўшчына). Асноўныя тыпы масленічных напеваў (пскоўска-смаленска-віцебскі, віцебска-аршанска-мсціслаўскі, клімавіцка-хоцімскі, гомельска-бранскі). Музычная стылістыка масленічных напеваў, яе блізкасць меласу веснавога абрадавага цыкла (загуканням, юраўскім (ягор’еўскім), троіцкім спевам). Масленічныя рэфрэны: «Гу-та-та, гу-ля-лё!», «Гу-ля-лё, рана маё!», «Масленіца, Масленіца!». Безрэфрэнныя масленічныя напевы (паўднёва-цэнтральная частка Беларускага Паазер’я (Барысаўшчына).

### *Тэма 14. Гуканне вясны*

Міфалагічная аснова абраду. Правядзенне абраду і яго ўдзельнікі. Рытуальнае значэнне агню ў абраднасці гукання вясны: спальванне зімы. Ушанаванне сонца ў веснавых рытуалах: спальванне кола на Пасожжы. Асаблівасці гукання вясны ў Лельчыцкім раёне (выпяканне «конікаў», упрыгожванне елкі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 15. Этнафонія песень гукання вясны*

Аграрна-магічная скіраванасць тэкстаў песень, міфапаэтычны вобраз вясны. Песні-вяснянкі (заклічкі): заклінальны, пабуджальны і патрабавальны характар музычнай і паэтычнай лексікі. Прыпевы ў песнях-вяснянках (глісандуючыя выгукі «У!», «Гу!»). Ладамеладычныя асаблівасці загуканняў. Этнафанічныя нормы абрадавых спеваў вясновага перыяду: «галосныя» спевы ў акустыцы адкрытай прасторы прыроднага асяроддзя; тэмбрава-дынамічная напружанасць песенных выказванняў; традыцыя жаночых гуртавых спеваў. Рэгіянальныя асаблівасці этнафанічнай экспрэсіі.

### *Тэма 16. Саракі*

Паходжанне назвы. Язычніцкае паходжанне свята. Багацце абрадава-гульнявых дзеянняў («сорак калёс», гушканне на арэлях, скокі на дошках). Абрад выгнання зімы ў Слонімскім раёне і на Мазыршчыне. Шанаванне птушак на Саракі. Рытуальнае печыва «сорак жаваранкаў». Народная метэаралогія і прыкметы свята. Хрысціянскае тлумачэнне свята.

### *Тэма 17. Дабравешчанне (Звеставанне)*

Этымалагічнае значэнне назвы. Адаптацыя народнай традыцыяй хрысціянскага значэння свята. Кола анімістычных вераванняў у прыкметах і забаронах гэтага дня (аграрная варажба). Выпяканне птушак з цеста. Чаканне буслоў. Хрысціянская канцэпцыя свята.

### *Тэма 18. Юр'е*

Міфалагічная аснова вобраза Юр'я, семантычная сувязь з вобразам Ягор'я – Георгія Перамоганосца. Сумяшчэнне элементаў земляробчай і жывёлагадоўчай абраднасці ў рытуалах Юр'ева дня. Засцерагальна-магічная сутнасць юраўскіх рытуалаў. Першы выган жывёлы. Прафілактычныя засцярогі статка. Замовы. Абрады пастухоў (апатрапеічныя рытуалы). Аграрна-магічная сутнасць абраду агледзінаў нівы. Гульнёва-абрадавыя дзеянні і павер'і, звязаныя з уяўленнем пра юраўскую расу, і адлюстраванне іх у юраўскіх песнях. Этнафанічныя асаблівасці юраўскіх песень заходняга Паазер'я (Пастаўшчына, Браслаўшчына, Мядзельшчына), яе падкрэсленая дэкламацыйнасць, лаканізм, суровасць тэмбравага каларыту. Дэкламацыйныя, за-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

клінальныя, меладычна гнуткія спевы Панямоння. Вядучы матыў песень: «адмыканне зямлі і выпусканне расы». Цэнтральныя персанажы – Юр'е (Юрай), Юр'ева маці. Юраўскія веснавыя карагоды («як ходзяць аглядаць жыта»).

### *Тэма 19. Вялікдзень (Пасха). Валачобны абрад і валачобныя песні*

Вербніца. Хрысціянскае значэнне свята. Вярба – галоўны атрыбут свята. Сістэма абрадавых дзеянняў Вербнай нядзелі, іх магічна-прадуцыравальны сэнс. Заклёны на здароўе. Чысты чацвер. Абрадавая атрыбутыка, сістэма рэгламентацый, сакральна-магічныя дзеянні, сувязь з народнай медыцынай. Семантыка ачышчэння. Вялікдзень (Пасха). Уваскрэсенне Ісуса Хрыста. Паняцце аб хрысціянскай Пасхаліі. Месца свята ў структуры традыцыйнага календара беларусаў. Падрыхтоўка і правядзенне сямейнай урачыстасці. Рытуальная ежа. Суадносіны аграрна-магічнай, засцерагальнай і велічальна-віншавальнай функцый у абрадавай практыцы і паэзіі. Этымалогія слова «валачобнікі». Абходы двароў валачобнікамі. Спецыфіка валачобных песень (абрадавы мужчынскі спеў). Сюжэтная разгорнутасць паэтычных тэкстаў валачобных песень. Народны каляндар у валачобнай паэзіі, вобраз гаспадарчага года, асвячэнне парадку гаспадарчых прац. Аграрна-прадуцыравальная аснова паэтычных матываў валачобных песень (усхваленне вясны, сонца, новага ўраджаю, нівы, гаспадарчага падвор'я, статкаў, палявых работ). Прыпевы (святочна-выгукавыя рэфрэны) валачобных песень: «Вясна красна на ўвесь свет!», «Вясна красна, дзень цёплы!», «Вясна красна на дварэ!», «Зялён явар кудравы!», «Сад зялёны вішнёвы!», «Віно ж ды віно, віно зеляное!», «Спявайце, братцы, спявайце!», «Няхай так будзе!», «Эй, лолам!», «Ой, ралё!» і інш. Сувязь валачобнага песеннага меласу з гераічным кантам і псалмамі (асабліва пра Уваскрэсенне Хрыста).

### *Тэма 20. Радаўніца (Радаўніцкія Дзяды, Наўскі Вялікдзень)*

Паходжанне назвы. Культ продкаў і яго сувязь з культам плоднасці. Памінанне памерлых (Дзяды масленічныя, троіцкія і восеньскія і Радаўніца). Рэгіянальныя асаблівасці адзначэння Радаўніцы на Панямонні (Гродзеншчына), на Паазер'і (Магілёўшчына, Віцебшчына).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 21. Ушэсце. Абрад ваджэння і пахавання стралы*

Адмысловая з’ява духоўнай культуры жыхароў сумежжа Падняпроўя і ўсходняга Палесся – абрад ваджэння і пахавання стралы. Значэнне свята ў кантэксце архаічных культаў пладнасці і продкаў. Значэнне свята ў кантэксце этнаэкалогіі. Карагоды «Страла», іх сувязь з абрадам. Рытмаінтанацыйная формула «Стралы». Тыповыя сюжэты. Выпяканне рытуальных страў. Неглюбскія «Старцы» як прыклад карнавальнай травестацыі. Семантыка і сімволіка святочных дзей.

### *Тэма 22. Сёмуха (Тройца, Зелянец, Зялёныя святкі)*

Агульнаславянскі характар абрадаў Зялёных святак. Язычніцкае і хрысціянскае паходжанні назваў. Магічна-абрадная аснова троіцкіх свят і прысвяткаў. Старажытны культ зяляніны (бярозы): завіванне вянкоў, кумаванне, ваджэнне куста. Генезіс і структура абраду «Куст». Ушанаванне русалак. Легенды, замовы, павер’і троіцкага тыдня, звязаныя з русалкамі. Правады русалкі (Розгары), асноўны змест і значэнне абраду. Троіцкія песні, іх функцыянальна-жанравыя разнавіднасці. Арэалы бытавання ў якасці духаўскіх (Магілёўскае Падняпроўе, Міншчына), куставых (Пінскае Палессе), русальных (Цэнтральнае і Гомельскае Палессе) песень. Сюжэты песень троіцкага тыдня: шэсце дзявочай грамады да бяроз, услаўленне бярозавага дрэва і інш. Рытмаінтанацыйная характарыстыка песень троіцкага цыкла. Троіцкія карагоды («Як завіваюць бярозу» – Магілёўшчына; «Як водзяць Куста» – Піншчына; «Як праводзяць русалку» – Гомельшчына).

## Раздзел V. Летні перыяд беларускага календара

### *Тэма 23. Купалле (Івана, Яна)*

Прыродныя і астральныя цыклы як аснова летняй абраднасці. Купалле, паходжанне назвы. Генезіс купальскіх звычаяў і абрадаў, іх агульнаеўрапейскія рысы. Архаічнасць Купалля – асноўнага ў сістэме геліяцэнтрычных абрадаў гадавога кола. Унікальнасць яго захаванасці ў традыцыйнай культуры беларусаў. Асноўныя этапы купальскага абраду, іх удзельнікі. Праяўленне культаў агню, вады, раслліннасці і іншых анімістычных вераванняў у сістэме купальскай абраднасці (развядзенне рытуальных агнёў, факельныя шэсці, абход палеткаў з палаючымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паходнямі, звычай сустрэчы ўзыходу сонца, пусканне вянкоў па вадзе, перакідванне іх праз вогнішча, спальванне «мая», паранне ў лазні з сабранымі зёлкамі, спальванне антрапаморфнай лялькі Марэны, кіданне ў ваду галавешак з вогнішча, купанне ў вадаёмах, качанне ў расе). Купальскія павер'і, легенды, прыкметы і паданні беларусаў. Хрысціянская царква ў барацьбе з купальскай абраднасцю. Сакральна-магічная аснова купальскага абраду: ваджэнне карагодаў, гульні і ігрышчы моладзі. Традыцыя карнавальнага пераапранання ў нябожчыкаў як магічны акт ачышчэння ад нячыстай сілы.

### *Тэма 24. Купальскія песні і гульні*

Гульні моладзі каля вогнішча (перакідванне вянкоў, паасобныя і парныя скокі праз касцёр, карагоды-ігрышчы шлюбнай накіраванасці). Гульнявыя элементы ў карнавальным абходзе вёскі. Спецыфічныя гульнявыя дзеянні купальскіх кірмашоў (спаборніцтвы на вадзе, конныя гульні, неафіцыйныя конкурсы гуртоў вясковых музыкаў). Адметныя гульнявыя дзеі купальскіх кірмашоў (наладжванне танцавальных збораў, арганізацыя водных маскарадаў і карнавалаў).

Купальскія песні, іх пераважная захаванасць у каляндарна-песеннай традыцыі Беларускага Паазер'я. Тэматычна-функцыянальная разнастайнасць купальскіх напеваў: песні падрыхтоўчага этапу (да збору зёлак і заклікання на свята); песні любоўнай і сямейнай тэматыкі; песні, якія суправаджалі выкананне карагодаў і гульняў; купальскія балады і інш. Іх ідэйны змест, салярная, аграрная, сямейна-родавая сімволіка, паэтычныя вобразы. Тыповыя прыпевы-рэфрэны: «Купала!», «Купала на Йвана!», «Ноч малая ды купальная!», «Іграй, сонца, із зарою!», «То-то!», «Купалля!», «Сонейка!», «Ой, рана на Йвана!» і інш. Асаблівасці структурна-рытмічнай формы беларускіх напеваў Купалля. Абрад бараны.

### *Тэма 25. Пятра і Паўла (Пятрок)*

Хрысціянскае тлумачэнне свята. Пятроўскі пост. Гаспадарчыя і метэаралагічныя прыкметы, звязаныя з гэтым днём. Фальклорны вобраз Пятра. Вяселлі на Пятроўку. Пятроўскія песні, інтанацыйная блізкасць з купальскімі.

### *Тэма 26. Ілля*

Хрысціянскае і язычніцкае паходжанні свята. Міфалагізм вобраза. Пераемнасць рыс бога Грамаўніка, Перуна. Вобраз Іллі-Грамавержца ў легендах. Павер'і і забароны, звязаныя з гэтым днём, метэаралагічныя прыкметы. Характар гаспадарчых работ гэтага часу.

### *Тэма 27. Жніўны абрадавы комплекс*

Агульнаславянскія элементы і нацыянальныя асаблівасці свята ўборкі хлеба. Месца жніва ў сістэме працоўных свят. Структура жніўнага рытуальна-абрадавага комплексу: зажынкі – уласна жніво – дажынкі. Абрадавыя дзеянні пачатку жніва: агледзіны нівы, пакрыванне поля, зажынкі. Аграрна-магічны сэнс абрадавых дзеянняў. Дажынкі – абрады завяршэння жніва. Анімістычныя і хрысціянскія элементы земляробчых рытуалаў у полі (абрад завівання барады, выраб дажыначнага снапа, пляценне дажыначнага вянка). Павер'е аб заломах.

### *Тэма 28. Этнафонія жніўных песень*

Функцыянальна-жанравыя групы жніўных песень: зажынкавыя, уласна жніўныя і дажыначныя. Этнафанічныя нормы выканання песень жніва: «галосныя» спевы ў акустыцы адкрытай прасторы прыроднага асяроддзя; тэмбрава-дынамічная напружанасць песенных выказванняў; традыцыя жаночых гуртавых спеваў. Рэгіянальныя этнафанічныя асаблівасці жніўных песень, драматызм, напружанасць гучання на Беларускім Палессі, стрыманасць, ураўнаважанасць выканання на поўначы Беларусі, маналагічныя «выказванні» Беларускага Паазер'я, рытмічна ўпарадкаваныя тыпы жніўных напеваў Магілёўшчыны, іх сувязь з карагоднай традыцыяй.

### *Тэма 29. Спасаўка (Мядовы Спас, Яблычны, Хлебны, Арэхавы)*

Хрысціянскае тлумачэнне свята. Звычаі свята і размеркаванне яго па тэрмінах: першы Спас – ужыванне гародніны і садавіны, другі Спас – яблыкаў, трэці Спас – хлеба. Народныя рэгламентацыі паводзін жанчын, наведванне могілак. Прыкметы і павер'і свята. Варажба аб ураджаі. Рабінавая ноч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел VI. Восеньскі перыяд беларускага календара

### *Тэма 30. Успенне (Першая Прачыста)*

Ідэя хрысціянскага свята. Заканчэнне летніх палявых работ. Абрады, звязаныя з пасевам азімых.

### *Тэма 31. Этнафонія песень восеньскага цыкла*

Функцыянальныя прыкметы восеньскіх песень: суправаджэнне працоўных форм земляробчай восені («яравыя», «авясец», «ільнавыя», «ягады беручы», «як мнуць проса»); жаночыя і дзявочыя спавяданні (песні лірычнай традыцыі: тэмы кахання, чакання сватоў, роздум дзяўчыны пра развітанне з родным домам і будучае жыццё на чужыне, скарга на цяжкі лёс у нялюбай сям'і мужа); кірмашовыя спеўныя спаборніцтвы (жартоўныя песні, лірычныя); пазаабрадавыя песні, якія выконваюцца «за кудзеляй», «абы калі». Разгорнутыя напевы восеньскіх песень (распеўнасць, рысы поліфанічнага шматгалосся), іх блізкасць да познетрадыцыйных лірычных песень.

### *Тэма 32. Багач (Другая Прачыста)*

Хрысціянская і язычніцкая канцэпцыі свята. Шанаванне Дажбога. Рэліктавы характар абраду Багача і яго аграрна-прадуцыравальны сэнс. Восеньскія кірмашы. Аграрная атрыбутыка абраду (калектыўны збор зернавых культур, выраб лубка з зернем і свечкай, абходы хат, калектыўная вячэра). Народныя прыкметы і павер'і, метэаралагічныя назіранні.

### *Тэма 33. Узвіжанне (Трэцяя Прачыста)*

Хрысціянская гісторыя свята. Народныя ўяўленні пра паходжанне свята. Паданні і вераванні Узвіжання (пра гадзюк і птушак). Замыканне зямлі на зіму.

### *Тэма 34. Пакровы*

Аграрная аснова свята. Хрысціянскія наслаенні. Пераасэнсаванне хрысціянскай назвы ў народнай традыцыі. Народныя ўяўленні аб замыканні зямлі на зімовы спачын. Пакроўскі пірог. Апрацоўка льну. Сувязь Пакроваў з абрадамі сямейна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

родавай скіраванасці. Провады хлопцаў у войска. Метэаралагічныя назіранні.

### *Тэма 35. Восеньскія (Змітраўскія) Дзяды, Асяніны*

Сувязь са старажытным культам продкаў. Спецыфіка правядзення памінальнага абраду, эмацыянальны настрой. Падзяка продкам за дапамогу ў завяршэнні спраў земляробчага календара. Павер'і. Выхаваўчае маральна-этычнае значэнне дзён памінання продкаў. Асаблівасці адзначэння Дзядоў у шляхецкім асяроддзі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Ліцьвінка, В. Д.* Святы і абрады беларусаў / В. Д. Ліцьвінка. – Мінск : Беларусь, 1997. – 176 с.

2. *Лозка, А. Ю.* Беларускі народны каляндар / А.Ю. Лозка. – Мінск: Полымя, 2002. – 237 с.

3. *Можейко, З. Я.* Календарно-песенная культура Белоруссии : опыт системно-типологического исследования / З. Я. Можейко. – Минск : Наука и техника, 1985. – 247 с.

4. *Мухарынская, Л. С.* Беларуская народная музычная творчасць : вучэб. дапам. для муз. ВНУ / Л. С. Мухарынская, Т. С. Якіменка. – Мінск : Выш. шк., 1993. – 343 с.

5. *Сысоў, У. М.* З крыніц спрадвечных / У. М. Сысоў. – Мінск : Выш. шк., 1997. – 415 с.

6. *Тавлай, Г. В.* Белорусское Купалье : обряд, песня / Г. В. Тавлай. – Минск : Наука и техника, 1986. – 172 с.

7. *Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 1 : Магілёўскае Падняпроўе. – 797 с.

8. *Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – Т. 2 : Віцебскае Падзвінне. – 910 с.

9. *Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў : у 6 т. Т. 3 : Гродзенскае Панямонне : у 2 кн., кн. 1 / В. І. Басько [і інш.] ; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай ; кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.] ; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Беларус. навука, 2006.

10. *Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў : у 6 т. Т. 4 : Брэсцкае Палессе : у 2 кн., кн. 1 / В. І. Басько [і інш.] ; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай ; кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.] ; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2009.

11. *Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў : у 6 т. Т. 5 : у 2 кн., кн.1 : Цэнтральная Беларусь / В. І. Басько [і інш.] ; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2010. – 847 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*

1. *Аляховіч, А. М.* Веснавыя святы / А. М. Аляховіч. – Мінск : Ураджай, 2000. – 254 с.

2. *Аляховіч, А. М.* Зімовыя святы / А. М. Аляховіч. – Мінск : Ураджай, 1998. – 134 с.

3. *Барышев, Г. К.* Батлейка / Г. К. Барышев – Мінск : Беларус. навука, 1995. – 143 с.

4. *Беларуская* міфалогія : энцыкл. слоўн. / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2004. – 506 с.

5. *Беларускія* народныя гульні і забавы / уклад. К. Л. Лабачэўская. – Мінск : Беларусь, 1996. – 31 с.

6. *Беларускія* народныя танцы, карагоды і гульні / уклад. В. С. Семенякоў. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 125 с.

7. *Беларусы.* Грамадскія традыцыі / рэдкал.: В. М. Бялявіна [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 606 с. : іл.

8. *Валачобныя* песні / склад.: Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей. – Мінск : Беларус. навука, 1980. – 654 с.

9. *Валачобныя* песні / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 572 с. – (Беларуская народная творчасць ).

10. *Варфаламеева, Т. Б.* Песні Беларускага Панямоння / Т. Б. Варфаламеева ; НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 287 с.

11. *Веснавыя* песні / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 563 с. – (Беларуская народная творчасць).

12. *Восеньскія* і талочныя песні / уклад.: А. С. Ліс, С. Т. Асташэвіч. – Мінск : Беларус. навука, 1981. – 496 с.

13. *Восточно-славянский* фольклор : слов. науч. и нар. терминологии / АН Беларуси, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы ; редкол.: К. П. Кабашников (отв. ред.) [и др.]. – Минск : Навука і тэхніка, 1993. – 478 с.

14. *Гурскі, А. І.* Святкаванне Каляд у Беларусі / А. І. Гурскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1998. – 168 с.

15. *Жаніцьба* Цярэшкі / уклад. Л. М. Салавей і І. Дз. Назінай. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 564 с.

16. *Жніўныя* песні / уклад.: А. С. Ліс, В. Г. Ялатава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1974. – 523 с.

17. *Земляробчы* каляндар : Абрады, звычаі / рэдкал.: А. С. Фядосік [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 2003. – 405 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

18. *Календарные* обычаи и обряды в странах зарубежной Европы : летне-осенние праздники / редкол.: С. А. Токарев, М. Н. Гроздова, Ю. В. Иванова [и др.]. – М. : Наука, 1978. – 295 с.

19. *Зімовыя* песні : калядкі і шчадроўкі / уклад. А. І. Гурскага. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 735 с.

20. *Крук, І. І.* Следам за сонцам: беларускі народны каляндар / І. І. Крук. – Мінск : Ураджай, 1998. – 216 с.

21. *Крук, І. І.* Сімволіка беларускай народнай культуры / І. І. Крук. – Мінск : Ураджай, 2001. – 350 с. : іл.

22. *Купальскія* і пятроўскія песні / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 562 с. – (Беларуская народная творчасць).

23. *Ліс, А. С.* Купальскія песні / А. С. Ліс. – Мінск : Навука і тэхніка, 1974. – 321 с.

24. *Ліс, А. С.* Валачобныя песні / А. С. Ліс. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 207 с.

25. *Ліс, А. С.* Жніўныя песні / А. С. Ліс. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 238 с.

26. *Мажэйка, З. Я.* Песні Беларускага Паазер'я / З. Я. Мажэйка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 494 с.

27. *Мажэйка, З. Я.* Песні Беларускага Падняпроўя / З. Я. Мажэйка, Т. Б. Варфаламеева ; НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – 392 с.

28. *Можейко, З. Я.* Песни Белорусского Полесья / З. Я. Можейко. – М. : Сов. композитор, 1983. – Вып. 1. – 183 с. : нот. ; 1984. – Вып. 2. – 151 с. : нот.

29. *Мухаринская, Л. С.* Белорусская народная песня : историческое развитие : очерки / Л. С. Мухаринская ; ред. З. Я. Можейко. – Минск : Наука и техника, 1977. – 216 с.

30. *Народная* культура Беларусі : энцыкл. даведнік. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 432 с. : іл.

31. *Пропп, В. Я.* Собрание трудов : Поэтика фольклора / В. Я. Пропп. – М. : Лабиринт, 1998. – 351 с.

32. *Сучкоў, І. І.* Фальклорны тэатр беларусаў : праблемы паэтыкі і эстэтыкі / І. І. Сучкоў. – Мінск : БДУК, 2004. – 306 с.

33. *Чистов, К. В.* Народные традиции и фольклор : Очерки теории / К. В. Чистов. – Л. : Наука, 1986. – 303 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Літаратура для самастойнай работы студэнтаў*

1. *Алексеев, Э. Е.* Фольклор в контексте современной культуры : рассуждения о судьбах народной песни / Э. Е. Алексеев. – М. : Сов. композитор, 1988. – 236 с.

2. *Арлова, Г. П.* Беларуская народная педагогіка / Г. П. Арлова. – Мінск : Нар. асвета, 1993. – 120 с.

3. *Барташэвіч, Г. А.* Беларуская народная паэзія веснавога цыкла: славянская фальклорная традыцыя / Г. А. Барташэвіч. – Мінск : Беларус. навука, 1985. – 98 с.

4. *Беларускі* фальклор : хрэстаматыя / склад.: К. П. Кабашнікаў, А. С. Ліс, А. С. Фядосік, І. К. Цішчанка. – Мінск : Выш. шк., 1985. – 749 с.

5. *Беларускі* фальклор : Жанры, віды, паэтыка : у 6 кн. / рэдкал.: А. С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.] ; АН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Беларус. навука, 2001 – 2006.

6. *Беларусы* / Г. А. Барташэвіч, Т. В. Валодзіна, А. І. Гурскі [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – Т. 7 : Вусная паэтычная творчасць. – 586 с.

7. *Богданович, А. Я.* Пережитки древнего миросозерцания у белорусов : Этнографический очерк / А. Я. Богданович. – Гродно : Губернская тип., 1895. – 185 с.

8. *Васілевіч, У. А.* Беларускі народны каляндар / У. А. Васілевіч. – Мінск : Ураджай, 1993. – 80 с.

9. *Грамадскі* быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі / В. К. Бандарчык, Л. І. Мінько, Г. І. Каспяровіч [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 248 с. : іл.

10. *Грамадскі* быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В. К. Бандарчык, Л. І. Мінько, Г. І. Каспяровіч [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 256 с. : іл.

11. *Грымаць, А. А.* Народная педагогіка беларусаў / А. А. Грымаць, Л. М. Варанецкая, У. В. Пашкевіч. – Мінск : Ул. М. Скакун, 1999. – 256 с.

12. *Грымаць, А. А.* Беларуская народная педагогіка ў школе : дапам. для студэнтаў і выкладчыкаў пед. вучылішчаў, каледжаў, інстытутаў і ўніверсітэтаў / А. А. Грымаць, Л. М. Варанецкая. – Мінск : БДПІ імя М. Танка, 1996. – 174 с.

13. *Гуд, П. А.* Беларускае Купалле : кампазіцыя і семантыка абрадавых дзей / П. А. Гуд. – 2-е выд., стэрэатып. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2006. – 137 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14. *Гурскі, А. І.* Чаму вучыць народная песня / А. І. Гурскі. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – 192 с.

15. *Дзіцячы* фальклор / рэд. К. П. Кабашнікаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 654 с.

16. *Дзіцячы* фальклор : зборнік фальклорных матэрыялаў / рэдкал.: У. А. Васілевіч [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2006. – 359 с.

17. *Кавалёва, Р. М.* Міфалогія ўсходнеславянскай анімалістычнай казкі / Р. М. Кавалёва // Фалькларыстычныя даследаванні: кантэкст, тыпалогія, сувязі : зб. арт. – Мінск : БДУ, 2004. – Вып. 4. – С. 92–98.

18. *Казакова, І. В.* Беларускі фальклор : тэставыя заданні / І. В. Казакова. – Мінск : РІВШ, 2006. – 131 с.

19. *Казакова, І. В.* Этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў / І. В. Казакова. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 150 с.

20. *Кухаронак, Т.* Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. Кухаронак. – Мінск : Ураджай, 2001. – 238 с. : іл.

21. *Мальдзіс, А.* Як жылі нашыя продкі ў XVIII ст. / А. Мальдзіс. – Мінск : Ураджай, 2001. – 178 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Веданне студэнтам асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны |
| 2 (два) | Устойлівая фіксацыя ў памяці студэнта асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны |
| 3 (тры) | Аднаўленне студэнтам часткі праграмнага матэрыялу па памяці. Ізаляванасць ведаў па асобных тэмах, персаналіях, крыніцах |
| 4 (чатыры) | Недастаткова сістэмнае ўсведамленне студэнтам вывучаемай дысцыпліны (сацыяльна-гістарычных працэсаў, фактараў уплыву на іх развіццё і інш.). Веданне навуковай і даведачнай літаратуры па каляндарна-абрадавым фальклоры |
| 5 (пяць) | Усведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (апісанне аб'ектаў вывучэння з тлумачэннем момантаў пераемнасці і ўзаемаўплываў). Наяўнасць неістотных памылак |
| 6 (шэсць) | Сістэмнае ўсведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Веданне асноўнай навуковай літаратуры па дысцыпліне. Наяўнасць неістотных памылак |
| 7 (сем) | Поўныя, трывалыя веды. Разгорнутае апісанне і тлумачэнне аб'ектаў вывучэння, раскрыццё сутнасці з'яў і фармуліроўка высноў. Уменне аналізаваць рэгіянальныя асаблівасці каляндарна-абрадавых комплексаў з улікам набытых ведаў. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 8 (восем) | Поўныя, трывалыя, глыбокія веды. Свабоднае аперыраванне вучэбным матэрыялам дысцыпліны. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацвярджэнне аргументамі і фактамі. Веданне асноўнай і дадатковай літаратуры па дысцыпліне. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 9 (дзевяць) | Сістэмнае веданне студэнтам каляндарна-абрадавага фальклору. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацвярджэнне аргументамі і фактамі. Уменне аналізаваць з'явы традыцыйнай духоўнай культуры з улікам набытых ведаў, карыстацца навуковай літаратурай па пытаннях дысцыпліны. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 10 (дзесяць) | Глыбокае асэнсаванне вывучаных з'яў. Разуменне студэнтам агульнатэарэтычных пытанняў каляндарна-абрадавага фальклору, актуальных праблем навукі. Уменне прымяняць свае веды ў кантэксце прафесійнай дзейнасці, аналізаваць з'явы традыцыйнай духоўнай культуры з улікам набытых ведаў, карыстацца навуковай літаратурай па пытаннях вывучаемай дысцыпліны |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі

Ацэнка і дыягностыка дасягненняў студэнтаў выконваецца паэтапна і ўключае:

– вуснае апытанне студэнтаў падчас заняткаў;

– выступленні на практычных і індывідуальных занятках;

– напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;

– напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі;

– выніковы кантроль у форме залікаў і экзаменаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ФАЛЬКЛОРНЫ ПРАКТЫКУМ**
**Раздзел 1. БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАЛЯНДАР**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05*
*Народная творчасць (фальклор)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2014. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,51. Ул.-выд. арк. 1,01. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ